М77

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

Педагогический факультет

2012

2022

# МОНИТОРИНГ КАЧЕСТВА ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ: ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ И ПУТИ РЕШЕНИЯ

## МАТЕРИАЛЫ МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

21—22 марта 2007 г.
г. Барановичи
Республика Беларусь

Библиотека БарГУ
0000 5152

Барановичи
РИО БарГУ
2007

29737
Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»

УДК 37(075.8)
ББК 74я73
М74

*Печатается по решению научно-методического совета учреждения образования «Барановичский государственный университет» (протокол от 28.03.2007 № 7)*

Рецензенты:

*Л. Малиновска*, доктор педагогических наук, Латвийский сельскохозяйственный университет, Латвия;
*Н. Я. Игнатенко*, доктор педагогических наук, профессор, Крымский гуманитарный университет, Украина

Редакционная коллегия:

Е. И. Пономарёва (главный редактор),
Ю. В. Башкирова, Г. И. Волчок, В. И. Денищик, Н. В. Ермалович, В. Н. Зуев, Е. Г. Карапетова,
З. Н. Козлова, З. В. Лукашеня, Ю. В. Маслов, Т. И. Нестерович, С. А. Порозов, Л. И. Станиславчик,
К. С. Тристень, Л. В. Урбанович, В. В. Хитрюк, О. М. Шавель

М74 **Мониторинг качества педагогического образования : теоретико-методологические основы и пути решения :** материалы Междунар. науч.-практ. конф., 21—22 марта 2007 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол. : Е. И. Пономарёва (гл. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2007. — 344 с. — 100 экз. — ISBN 978-985-498-081-2

В материалах докладов освещаются актуальные проблемы мониторинга качества педагогического образования, рассматриваются его организационно-управленческие вопросы, аспекты определения критериев и показателей качества, опыт работы учреждений образования и, в частности, преподавателей. В сборник вошли материалы, отражающие результаты теоретических и практических исследований, проведенных в педагогических вузах Беларуси и зарубежья.

Сборник представляет интерес для широкого круга специалистов сферы педагогического образования, преподавателей, аспирантов, студентов вузов.

**УДК 37(074.78)**
**ББК 74я73**

ISBN 978-985-498-081-2

© Коллектив авторов, 2007
© БарГУ, 2007

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ
ДЛЯ НАУЧНОЙ РАБОТЫ

## 3 МОНИТОРИНГ ОСНОВНЫХ ПОКАЗАТЕЛЕЙ КАЧЕСТВА ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА В ВЫСШЕЙ ШКОЛЕ ........ 185


**Бабенко Л. Ф.** Технология непрерывной аттестации студентов как элемент системы мониторинга ........ 185
**Башкирова Ю. В.** Эмоциональный фактор в оценивании уровня учебных достижений: мониторинговый ракурс ........ 186
**Гаманович В. Э.** Курс «Методика воспитательной работы» как средство эвристического обучения студентов-тифлопедагогов ........ 187
**Дубинко Н. А.** Активные методы обучения в процессе переподготовки руководителей ........ 189
**Ермалович Н. В.** Основные показатели развития языковой компетенции будущих учителей-филологов как объект мониторинга ........ 191
**Залыгина Н. А., Хващевская Е. В.** Мониторинг развития профессионально-этических качеств у студентов, будущих специалистов по социальной работе с семьей и детьми ........ 193
**Зуев В. Н.** К вопросу о диагностике качества экологического образования в профессиональной школе ........ 196
**Иванченко Т. Н.** Параметры отслеживания результативности учебного процесса ........ 200
**Игнатович В. Г., Климович Ю. М.** Теоретические подходы к проведению мониторинга качества воспитания студентов педагогических специальностей ........ 201
**Карпович Е. Б.** Развитие научных основ современной теории воспитания как необходимое условие обеспечения качества образовательного процесса ........ 202
**Кокоза Т. Д.** Методические основы определения коммуникативной значимости языковых единиц в предложении и тексте ........ 204
**Коробович Л. П.** Моніторинг діяльності педагогічних працівників вищого навчального закладу недержавної форми власності ........ 207
**Коробович Л. П.** Управління якістю підготовки спеціалістів в умовах переходу до ринково-економічних відносин ........ 212
**Королева Н. А.** Методы активного обучения как фактор повышения качества образования ........ 216
**Кубанская Л. Л., Маліноўскі Я. Л.** Крыжовы метад у даследаванні асабістага ўзросту ........ 218
**Лобанов А. П., Дроздова Н. В.** Проблемы проектирования учебно-методических комплексов в контексте образовательных технологий ........ 221
**Майсеня Л. І.** Да праблемы якасці непарыўнай прафесійнай адукацыі ........ 223
**Макаренко Н. С., Баженова И. В.** О внедрении профессионально-ориентированного мониторинга в систему иноязычного образования в вузе ........ 226
**Мартынович В. Г.** Тестовый контроль знаний ........ 229
**Селезнёв А. А.** Диагностика развития психологической культуры учащейся молодежи в процессе профессионального образования ........ 230
**Селивоник С. В.** Организация проведения мониторинга качества математической подготовки абитуриентов ........ 234
**Субботина В. П.** Развитие критического мышления в процессе изучения философии ........ 236
**Цыркунов В. М., Богуцкий М. И., Кравчук Ю. В.** Мониторинг основных показателей качества образовательного процесса на клинической кафедре медицинского вуза ........ 237
**Шавель В. М.** Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці студэнтаў на занятках па беларускай мове ........ 240
**Шахнюк А. З.** Диалоговое обучение как одна из форм реализации мониторинга качества обучения ........ 243
**Яцук А. И., Терехова Т. Н.** Научно-исследовательская работа студентов в медицинском вузе ........ 245


## 4 МОНИТОРИНГ ФИЗИЧЕСКОГО РАЗВИТИЯ И ФОРМИРОВАНИЯ ЗДОРОВОГО ОБРАЗА ЖИЗНИ ........ 246


**Ахмаева И. В.** Модульные технологии как одно из средств повышения эффективности процесса обучения самоконтролю студенческой молодежи ........ 246
**Башкова Л. Н.** Основы профессиональной компетентности педагогов в области формирования культуры здоровья школьников ........ 248
**Бейлин В. Р.** Методические особенности обучения гимнастическим упражнениям школьников ........ 250
**Берташ А. И., Шило О. В.** Валеологический подход к формированию здорового образа жизни студентов ........ 252
**Беспутчик В. Г.** Физическое развитие учащихся младших классов инновационных школ с углубленным изучением предметов ........ 253
**Бусик Н. И., Филимонов Н. Н.** Формирование культуры здорового образа жизни студентов в процессе занятий оздоровительной аэробикой ........ 255
**Великороднов С. В., Леус Л. И., Плавская А. А.** Сравнительная оценка ряда показателей здорового образа жизни школьников школы № 166 г. Минска с республиканскими данными ........ 257
**Веренич С. В.** К вопросу о мониторинге состояния здоровья и физического развития студентов ........ 260
**Денищик В. И.** Ценностные ориентации в процессе формирования физической культуры студентов ........ 261
**Дмитриева Н. И., Модринская Ю. В., Руденкова Н. П.** Методика мониторинга формирования здорового образа жизни среди студентов-стоматологов ........ 263
**Дмитриева Н. И., Наумова Н. И.** Роль преподавателя в предупреждении развития у студентов профессионально обусловленных заболеваний ........ 265
**Жуков О. Ф., Левушкин С. П.** Обучение культуре здоровья в образовательных учреждениях ........ 266
**Иванов В. Г., Радькова Р. В.** Определение уровня физической работоспособности у студенток-первокурсниц по тесту $PWC_{107}$ (V) ........ 269
**Казеко Л. А., Латышева С. В.** Методологические основы программ профилактики стоматологических заболеваний в Республике Беларусь ........ 271

подготовленные студентами, используются ими в дальнейшем, после распределения, во время работы в лечебных учреждениях на информационных днях.

Таким образом, реализуемая в клинике инфекционных болезней комплексная оценка знаний, включающая традиционные методики и новые информационные технологии, позволяет повысить качество обучения на клинической кафедре и существенно улучшить подготовку специалистов с высшим медицинским образованием.

### Список источников

1. *Богин, И. Б.* О педагогической квалификации преподавателя медицинского вуза / И. Б. Богин, И. Н. Денисов, И. И. Косарев // Здравоохранение Рос. Федерации. — 1993. — № 8. — С. 24—26.

2. *Богуцкий, М. И.* Последипломное образование в профессиональной деятельности преподавателя-клинициста / М. И. Богуцкий // Настоящее и будущее последипломного образования : материалы Респ. науч.-практ. конф., посвященной 75-летию БелМПО, Минск, [?] / [?] : в 2 т. — Минск, 2006. — Т. 1. — С. 21—23.

3. Инновации в образовании / А. Н. Косинец [и др.] // Медицинское образование XXI века : материалы Междунар. конф., Витебск, [?] / [?]. — Витебск, 2004. — С. 3—8.

4. *Цыркунов, В. М.* Контролируемая самостоятельная работа студентов как неотъемлемый элемент учебного процесса / В. М. Цыркунов, М. И. Богуцкий // Контролируемая самостоятельная работа студентов в образовательном процессе : пути и методы совершенствования : сб. науч. тр. / [?]. — Гродно : ГрГМУ, 2006. — С. 220—222.

5. *Цыркунов, В. М.* Практическая подготовка студентов на клинической кафедре / В. М. Цыркунов, М. И. Богуцкий // Медицинское образование XXI века : материалы Междунар. конф., Витебск, [?] / [?]. — Витебск : ВГМУ, 2006. — С. 143—144.

6. *Цыркунов, В. М.* Формы и перспективы использования дистанционного обучения на кафедре инфекционных болезней / В. М. Цыркунов, М. И. Богуцкий, Ю. В. Кравчук // Прогрессивные технологии в учебном процессе : сб. науч. работ межвуз. науч.-метод. конф., Гродно, [?] / [?]. — Гродно, 2005. — С. 65—66.

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**В. М. Шавель**

Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт»,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, pf-barsu@ tut.by

**Резюме.** Использование активизирующих возможностей учебников и заданий на выбор в процессе преподавания белорусского языка в университете способствует повышению качества подготовки будущих специалистов.

**Abstract.** The usage of activating opportunities of books and tasks with multiple choice while teaching Belorussian at University promotes quality improvement of future specialists training.

**Ключавыя словы:** актывізацыя, пазнавальная дзейнасць, заданні на выбар, сутнасная характарыстыка пазнавальнай дзейнасці, узроўні пазнавальнай дзейнасці.

Вучэбнае пазнанне працякае ў асноўным двума шляхамі: рэпрадуктыўным і творчым, таму і ўзровень пазнавальнай актыўнасці можа быць розным: актыўнасць, якая адпавядае рэпрадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці, і актыўнасць, якая суправаджае творчую пазнавальную дзейнасць. Авалоданне студэнтамі той ці іншай формай пазнавальнай дзейнасці можа сведчыць аб сфарміраванасці пазнавальнай актыўнасці на дадзеным этапе, а ўзроўні пазнавальнай актыўнасці можна выкарыстоўваць ў якасці крытэрыяў. Але выкарыстання толькі гэтых крытэрыяў яўна недастаткова, так як яны не даюць магчымасці ацаніць асобныя бакі пазнавальнай актыўнасці студэнтаў, таму, зыходзячы з сутнаснай характарыстыкі пазнавальнай актыўнасці, будзем абапірацца на крытэрыі, абгрунтаваныя В. А. Зімненка: крытычныя адносіны да вынікаў вучэбнай дзейнасці (як сваёй, так і таварышаў па групе), імкненне пазнаваць новае, стан ведаў па прадмеце ў адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы па мове, уменне выдзяляць істотныя прыметы ў моўным матэрыяле, параўноўваць, а таксама рабіць вынік і даказваць, уменне планаваць сваю работу: «з чаго пачну», «як буду працягваць», «чым скончу», уменне правесці самаправерку, моўная актыўнасць: уменне дакладна і хутка арыентавацца ў моўнай сітуацыі, пераадольваць цяжкасці, якія ўзнікаюць у вучэбнай рабоце [2].

Выкарыстанне крытэрыяў у сукупнасці дазваляе вызначыць тры ўзроўні пазнавальнай актыўнасці студэнтаў на занятках па мове:

*Першы* — высокі: студэнты заўсёды праяўляюць ініцыятыву, хутка і беспамылкова выдзяляюць істотныя прыметы ў моўным матэрыяле, умеюць абагульняць, ставіць пытанні да вывучанага, без цяжкасцей пераносяць веды ў новыя сітуацыі, заўсёды даводзяць пачатую справу да канца, умеюць сябе праверыць, усведамляюць ход і вынікі сваёй работы.

*Другі* — сярэдні: студэнты, як правіла, выконваюць патрабуемае, з дапамогай дадатковых пытанняў выкладчыка выдзяляюць істотныя прыметы ў моўным матэрыяле, адчуваюць цяжкасці ў абагульненні і пастаноўцы пытанняў, не заўсёды правільна пераносяць веды ў новыя сітуацыі, ажыццяўляюць планаванне з дапамогай выкладчыка, пры праверцы сваіх вынікаў дапускаюць памылкі.

Табліца — Адпаведнасць практыкаванняў узроўням пазнавальнай актыўнасці

| Падручнікі | Усяго практыкаванняў | | I узровень | | II узровень | | III узровень | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | абсалютны лік | % | абсалютны лік | % | абсалютны лік | % | абсалютны лік | % |
| Беларуская мова: ч. 1 | 463 | 100 | 246 | 53,1 | 156 | 34,4 | 58 | 12,5 |
| Беларуская мова: ч. 2 | 275 | 100 | 154 | 56,0 | 81 | 29,4 | 40 | 14,5 |

*Трэці* — нізкі: студэнты ніколі не праяўляюць ініцыятывы на ўроку, адчуваюць цяжкасці ў выдзяленні прымет у моўным матэрыяле, не ўмеюць ставіць пытанні, не спраўляюцца з заданнямі на абагульненне і планаванне, пераважна правільна выконваюць заданні рэпрадуктыўнага характару, не праводзяць самаправерку.

Пры вызначэнні ўзроўняў пазнавальнай актыўнасці студэнтаў можна выкарыстаць матэрыял падручнікаў па беларускай мове, узяўшы за аснову ўзровень складанасці работы з моўным матэрыялам і паслядоўнасць яго выканання. Складанасць моўнага матэрыялу можна вызначыць па тым, якім метадам арганізуецца вучэбна-пазнавальная дзейнасць.

Першы ўзровень актыўнасці забяспечваецца выкарыстаннем метаду навучання ўзнаўленню і аналізу гатовых тэкстаў, сказаў, словазлучэнняў, слоў; другі — метаду навучання выбару моўных сродкаў па вядомаму ўзору ў сувязі са змяненнем дадзеных тэкстаў, сказаў, словазлучэнняў, слоў; трэці — метаду навучання творчаму выкарыстанню моўных сродкаў у сувязі са стварэннем тэкстаў, сказаў, словазлучэнняў, утварэннем слоў.

Размяжоўваючы пазнавальную актыўнасць трох узроўняў, мы зыходзім з таго, што актыўнасць першага ўзроўню якасна адрозніваецца ад актыўнасці трэцяга. Па сутнасці адрозненне складаецца ў тым, што якасныя змены ідуць у напрамку змяншэння рэпрадукцыі і павелічэння элементаў творчасці ў вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Такім чынам, веданне магчымасцей падручнікаў па беларускай мове ў плане фарміравання пазнавальнай актыўнасці студэнтаў дапаможа адкрыць рэзервы, якія маюцца.

Намі былі прааналізаваны дзеючыя падручнікі па беларускай мове: умовы да практыкаванняў і іх магчымасці ў фарміраванні пазнавальнай актыўнасці студэнтаў.

Даныя аналізу практыкаванняў па двух падручніках пададзены для нагляднасці ў табліцы.

Праводзячы аналіз, мы кіраваліся, перш за ўсе, такім палажэннем: паколькі працэс навучання можа працякаць на розным узроўні пазнавальнай актыўнасці студэнтаў, таму адным са шляхоў павышэння актыўнасці можа стаць пераход ад форм дзейнасці, якія выклікаюць рэпрадуктыўную актыўнасць, да дзейнасці, якая суправаджаецца творчай актыўнасцю.

Такі падыход да рашэння праблемы магчымы толькі тады, калі навучанне будуецца на аснове ўліку якаснай характарыстыкі пазнавальнай актыўнасці. Пры гэтым акцэнт павінен быць зроблены на фарміраванні ўменняў выдзяляць істотныя прыметы ў моўным матэрыяле, параўноўваць, рабіць выбар і даказваць.

Па нашым меркаванні, адным са сродкаў, які будзе спрыяць стварэнню ўмоў для фарміравання пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці на занятках па мове могуць быць заданні на выбар: сітуацыя выбару пабуджае ініцыятыву і патрэбу ў праяўленні творчых сіл.

Дзякуючы прымяненню заданняў на выбар аказваецца магчымым вызначыць узровень пазнавальнай актыўнасці студэнтаў на аснове паказчыкаў, якія праяўляюцца толькі ў сітуацыі выбару.

Эфектыўнасць уздзеяння заданняў на выбар дасягаецца, калі яны паступова ўскладняюцца па гадах навучання і ў прапанаваных на выбар спалучэннях паўтараюцца тыпы і віды заданняў. Сістэма заданняў на выбар абапіраецца на сістэму практыкаванняў падручніка і звязана з ёй. Заданні на выбар могуць выконвацца побач з практыкаваннямі падручніка і ажыццяўляць той жа напрамак у развіцці пазнавальнай актыўнасці.

Работа з заданнямі на выбар мяняе падыход студэнтаў да вучэбнага матэрыялу: увага засяроджваецца на сутнасці моўных з'яў, пашыраецца сфера прымянення ведаў, змяняюцца матывы, якімі кіруецца студэнт, выбіраючы заданне.

Студэнты, якія пастаянна працуюць з заданнямі на выбар, дэманструюць больш высокую ступень разумення ўнутранай логікі вывучаемага прадмета, авалодання рацыянальнымі спосабамі разумовых дзеянняў, у прыватнасці, уменнямі аналізаваць, выдзяляць істотнае, агульнае ў граматычных з'явах, выказваць самастойныя меркаванні. У сукупнасці ўсе гэтыя змены знаходзяць сваё выражэнне ў тым, што называецца павышэннем пазнавальнай актыўнасці.

Практыка паказвае, што ўвядзенне заданняў на выбар у шэраг трэніровачных практыкаванняў не заўсёды мэтазгодна. Іх не варта прапаноўваць, калі матэрыял яшчэ не ўсвядомлены студэнтамі ці тэма складаная і патрабуецца працяглае замацаванне матэрыялу. Абмежаванні ў прымяненні заданняў на выбар часам нясе і сам матэрыял: заданне, якое патрабуе лагічнай перапрацоўкі вывучанага, можа прапаноўвацца толькі на матэрыяле, які дае магчымасць зрабіць абагульненне, ажыццявіць перанос ведаў. Абмежаванні звязаны і з аб'ёмам работы выкладчыка: выкарыстаныя заданні на выбар неабходна правяраць поўнасцю, а пасля праверкі аналізаваць.

Намі была зроблена спроба ўстанавіць матывы, якімі кіруюцца студэнты, выбіраючы заданне (яны маглі служыць паказчыкам узроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці). Адказваючы на пытанні анкеты, студэнты павінны

былі ўказаць, што іх больш цікавіць: работа з выбарам задання ці без выбару і чаму, а таксама матываваць выбар задання. Аналіз атрыманых матэрыялаў дазволіў выдзеліць сем тыпаў матываў:

*I тып* — матывы, якія маюць практычнае значэнне для студэнтаў: тое, што выкарыстоўваецца ў асабістым вопыце (карысныя заданні);

*II тып* — матывы, звязаныя з эмацыянальнымі перажываннямі пры ўключэнні ў самастойную дзейнасць і праяўленнем інтэлектуальных сіл (падабаецца);

*III тып* — матывы, звязаныя з патрэбай асобы ў праяўленні сябе, у самасцвярджэнні (цікава, на што здольны);

*IV тып* — матывы, якія маюць у сваёй аснове патрэбу ў навізне (пазнаю шмат новага);

*V тып* — матывы, у якіх адлюстраваны эмацыянальныя перажыванні, суб'ектыўна звязаныя з радасцю ад-крыцця (цікава зрабіць вынік, стварыць штосьці самому);

*VI тып* — матывы, якія адлюстроўваюць патрэбу ў праяўленні творчых сіл (думаеш па-свойму і адчуваеш сябе свабодным; можна па-сапраўднаму разгарнуцца);

*VII тып* — матывы тых студэнтаў, якія лічаць,што лепш, калі заданне даецца без магчымасцей выбару (люблю, калі ўказана дакладна, што трэба зрабіць; звычайнае практыкаванне заўсёды лягчэйшае).

Усяго адказвала на пытанні анкеты 159 чалавек: з іх 146 лічыць, што лепш, калі маецца магчымасць зрабіць выбар з заданняў рознай складанасці. Па тыпах матывацыі выбару задання вынікі анкетавання размеркаваліся наступным чынам: I тып — 13 чалавек, II тып — 30 чалавек, III тып — 18 чалавек, IV тып — 7 чалавек, V тып — 39 чалавек, VI тып — 41 чалавек, VII тып — 11 чалавек (5 чалавек спалучаюць матывы III і VI тыпаў).

Крыніцы матываў IV, V, VI тыпаў ідуць, як лічыць В. А. Зімненка, ад самой пазнавальнай дзейнасці студэнта, матывацыя гэтых тыпаў характэрна для высокага ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці.

Крыніцы матываў I і III тыпаў не ідуць ад самой пазнавальнай дзейнасці, матывацыя гэтых тыпаў характэрна для больш нізкага ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці, як і II тыпу, дзе матывацыя неканкрэтная, актыўнасць няўстойлівая. VII тып матываў паказвае на недастатковую падрыхтаванасць студэнтаў [1].

Спецыфічнасць умоў, ствараемых своеасаблівасцю даследуемага прыёма, дазваляе ўстанавіць адрозненне не толькі ў матывацыі выбару студэнтам задання, але і ў некаторых іншых істотных асаблівасцях пазнавальнай дзейнасці. На аснове ўстаноўленых адрозненняў вызначаецца ўзровень пазнавальнай актыўнасці: 1) выкарыстанне магчымасці выбару варыянта, які патрабуе ад студэнта большай разумовай самастойнасці; 2) усведамленне ступені складанасці прапанаваных заданняў; 3) накіраванасць пазнавальнага пошуку пры выбары задання; 4) адпаведнасць паміж складанасцю варыянта і паспяховасцю задання; 5) самастойнасць пры выкананні задання; 6) ініцыятыўнасць пры выбары; 7) матывацыя выбару. Па кожнаму з гэтых крытэрыяў маецца вышэйшы, ніжэйшы і сярэдні паказчык.

Размеркаванне студэнтаў па ўзроўнях пазнавальнай актыўнасці на пачатку работы з заданнямі на выбар, %:

| | |
|---|---|
| першы ўзровень | 7 |
| другі ўзровень | 40 |
| трэці ўзровень | 45 |
| не выбралі варыянт, які патрабуе большай самастойнасці | 8 |
| прынялі ўдзел у эксперыменце | 100 |

З прыведзеных дадзеных відаць, што 53% студэнтаў не маюць устойлівага імкнення выконваць работу, якая патрабуе большай самастойнасці, выбіраюць больш складаны варыянт рэдка ці зусім не выбіраюць яго; 7% студэнтаў адчуваюць вострую неабходнасць у рабоце, якая дазваляе праявіць большую самастойнасць і ініцыятыўнасць, і, адпаведна, звычайна працуюць на ўзроўні, які ніжэйшы за іх пазнавальныя магчымасці; 40% — маюць устойлівыя імкненні да выканання варыянта, які патрабуе большай самастойнасці.

Пры пастаянным выкарыстанні заданняў на выбар паступова змяншаецца колькасць студэнтаў, аднесеных да III узроўню, і павялічваецца колькасць, аднесеных да I і II узроўняў.

Размеркаванне студэнтаў па ўзроўнях пасля другога года работы з заданнямі на выбар, %:

| | |
|---|---|
| першы ўзровень | 72 |
| другі ўзровень | 25 |
| трэці ўзровень | 3 |
| не выбралі варыянт, які патрабуе большай самастойнасці | 0 |
| прынялі ўдзел у эксперыменце | 100 |

Паступовае назапашванне паказчыкаў больш высокага ўзроўню прыводзіць да пераходу на другі ўзровень, што сведчыць аб пэўным узроўні развіцця пазнавальнай актыўнасці ў студэнтаў і авалоданні імі вучэбным матэрыялам і спосабамі дзеяння. Гэты пераход не адбываецца сам па сабе, яго паступова рыхтуюць умовы, стварэнню якіх садзейнічаюць заданні на выбар. Здабыткам практыкі універсітэта заданні на выбар на занятках па мове могуць стаць толькі ў тым выпадку, калі яны ўвойдуць у дыдактычны матэрыял і метадычныя дапаможнікі для выкладчыка. Абгрунтаваным было б уключэнне заданняў на выбар у сістэму практыкаванняў падручніка па беларускай мове, змест лабараторных і самастойных работ.

### Спіс крыніц


1. *Антанюк, Л. А.* Рэалізацыя навучальных і навукова-пазнавальных мэт у працэсе выкладання сучаснай беларускай мовы / Л. А. Антанюк. — Мінск, 1994.

2. *Зимненко, В. А.* Пути повышения познавательной активности младших школьников при изучении морфологии / В. А. Зимненко. — М., 1986.